Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava I69

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1989 ГОДУ («ПРАМЕНЬ»-«ПАГОНЯ»)

ЗА НАШУЮ ДЫ ВАШУЮ ВОЛЮ!

# ПАГОНЯ

№8(10) • ЖНІВЕНЬ • 1990 г.

ЛЕПЕЛЬСКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЭТА

## = П А Г О Н Я =

Толькі ў сэрцы трывожна пачую
За краіну радзімую жах,—
Успомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.

У белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка храпяць.
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць!

У бязьмерную дель вы ляціце,
А за вамі, прад вамі гады.
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо, яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі у пагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?!

Бейце ў сэрцы іх, бейце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць.

Маці родная, маці-краіна!
Не уцешыцца гэтакі боль...
Ты прабач, ты прымі свайго сына,
За цябе яму ўмерці дазволь.

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць.
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць!

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

# ЁСЬЦЬ ТАКАЯ ПАРТЫЯ!

## ВІТАЕМ СТВАРЭНЬНЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ !

23-24 чэрвеня ў Менскім тэхналягічным інстытуце адбылася Ўстаноўчая канфэрэнцыя Нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі /НДПБ/. У ёй узялі ўдзел 5 дзесяткаў дэлегатаў. У тым ліку—9 ад Віцебскае вобласьці /3 зь Віцебску, 4 з Наваполацку, 2 зь Лепелю/. Былі прыняты Статут ды іншыя дакуманты НДПБ. Зьмяшчаем іх цалкам.

### С Т А Т У Т

### НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

НДПБ—самастойная, незалежная грамадзка-палітычная арганізацыя, якая аб"ядноўвае аднадумцаў, што змагаюцца за нацыянальнае Адраджэньне, дэмакратызацыю, палітычную, эканамічную і культурную самастойнасьць беларускага народу. Найпершая задача НДПБ—падрыхтоўка ў Рэспубліцы варункаў, якія дазволяць вольнаму народу вольна вырашаць свой лёс.

НДПБ не зважае на падзел грамадзтва на рабочых, сялян ды інтэлігенцыю і абапіраецца ў сваёй дзейнасьці на ўсіх нацыянальна сьвядомых, прагрэсіўна настроеных грамадзянаў. НДПБ дзейнічае ў рамках Канстытуцыі Беларусі, дамагаецца пастаўленых мэтаў парлямэнцкім шляхам. Пры антыгуманных і антызаконных дзеяньнях супраць НДПБ альбо грамадзянаў Рэспублікі НДПБ пакідае за сабою права выбару іншых шляхоў дзейнасьці.

### 1. Члены НДПБ

Арт.1,1. Членам НДПБ можа быць любы грамадзянін Беларусі ці іншае дзяржавы незалежна ад месца жыхарства, веравызнаньня, сацыяльнага становішча, які валодае беларускай мовай і ўсьведамляе сябе беларусам, прызнае Праграму і Статут НДПБ, дасягнуў 18 гадоў, працуе ў адной зь яе першасных арганізацыяў, плаціць членскія складкі.

Арт.1,2. Член НДПБ адначасова ня можа зьяўляцца членам іншае палітычнае партыі.

Арт.1,3. Член НДПБ мае права на свабоду слова і крытыкі, на кантроль дзейнасьці любога яе выбарчага воргана, выбіраць і быць абраным ва ўсе структуры НДПБ, можа ўваходзіць у любое грамадзкае, дзяржаўнае фармаваньне, абавязаны змагацца за дасягненьне мэтаў, што ставіць перад сабою НДПБ.

АРТ.1,4. Прыём у члены НДПБ ажыцьцяўляе першасная арганізацыя па асабістай заяве кандыдата, пры наяўнасьці трох рэкамендацыяў членаў НДПБ. Член НДПБ, які даў рэкамендацыю, на працягу аднаго года нясе асабістую адказнасьць за рэкамендаванага. Кандыдат такосама запаўняе ўліковую картку члена НДПБ, падае аўтабіяграфію. Прынятым лічыцца той, за каго пададзена ня менш за 2/3 галасоў прысутных на паўнамоцным сходзе першаснае арганізацыі, але ня менш за палову ад яе сьпісавага складу. Член НДПБ атрымлівае членскі білет, плаціць уступную складку ня менш за 10 рублёў.

Арт.1,5. Выхад з НДПБ ажыцьцяўляецца па асабістай заяве члена партыі.

Арт.1,6. Член НДПБ абавязаны:
- выконваць Статут, ажыцьцяўляць Праграму НДПБ,

# ПАГОНЯ №8(10)

## РАДКІ З ДОПІСАЎ

...Нягледзячы на тое, што мітынг быў забаронены, сьвяткі з нагоды ўгодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі адбыліся. 25 сакавіка на пляцу Волі сабралася пэўная колькасьць людзей. Шмат у каго гальюны былі павязаны стужкамі з выявай Пагоні ды надпісам: "Дзень Волі"...Некалькі бел-чырвона-белых сьцягоў лунала на ветру...

НАТАЛЬЛЯ МАЛЯУКА.
ВІТЭБСК.

x x x

...Прапаную колькі слоў гумару для "Пагоні".

НОВЫЯ ЧАСЫ—НОВЫЯ ЛОЗУНГІ

Уся ўлада—прэзідэнцкім саветам!
К 2000 году каждой советской семье—отдельную от Советского Союза квартиру!

ЛОЗУНГ ПА-ТРАСЯНСКУ

Блага народу—мэта партыі.

ПЫТАНЬНЕ Ў ЛОБ

Калі ў нас адзіная маці—Айчына, дык хто ж тады бацька?
Хто, ДЗЕ МЯНЬЦІЦЬ лухту?

ЛОГІКА ШКОЛЬНІКА

—Інтэрнацыяналізм—ад слова інтэрнат.

ЛОГІКА АМЭРЫКАНЦА

—Хто такі Слава Труду? Чым ён знакаміты, што яго імя ёсьць на кожным вашым прадпрыемстве?

ЗНОЎ ЛОГІКА ШКАЛЯРА

—...КПССР...

НАРОДНЫ ГУМАР

—Ці ёсьць у нашым парлямэнце дваране?
—А як жа? Напрыклад, дэ Мэнтэй.

Ю. СЬЦЯПАНАЎ,
САКРАТАР ВІТЭБСКАЕ РАДЫ БНФ.

x x x

...Зьвяртаецца да Вас лепяльчук па нараджэньню. Віктар Салівон. Я зь вялікае павагаю адношуся да Вашае гераічнае працы па захаваньню роднае мовы ды нефармальнае дзейнасьці. Аб гэтым ведаю ня толькі з нумароў "Позірку", які часам купляю на мітынгах. І мне вельмі прыемна бачыць Вашае выданьне ў Менску ды чытаць праўдзівыя зьвесткі з бацькаўшчыны. З аповядаў майго дзядзькі І.Завацкага, які нейкі час працаваў на заводзе, я шмат даведаўся аб Вас як чалавеку...пра сябе: нарадзіўся 23 ліпеня 1973 году...у вёсцы Грынпольле /калгас імя Чапаева/...сябрам нефармальнае суполкі яшчэ не зьяўляюся...

ВІКТАР САЛІВОН.
МЕНСК.

x x x

...Вам пишет коллекционер газет из Новосибирска... Отец мой белорус, по-белорусски я неплохо читаю и говорю. Но достать белорусские газеты в Новосибирске очень сложно. Приходится обращаться в редакцию. Не могли бы вы выслать мне один экземпляр вашей газеты "Прамень" /цяпер—"Пагоня", рэд./

ДМИТРИЙ ПРИБАЛОВЕЦ.
НОВОСИБИРСК.

x x x

...Даведаўся пра з"езд ліберальных /нацыянальных, рэд./ дэмакратаў у праграме "Час", ніякіх падрабязнасьцей не ведаю, калі ёсьць магчымасьць паведаміце.

Вялікі дзякуй за "Пагоню". Першы нумар атрымаўся неблагім.

СЯРГЕЙ САЛОДКІН.
ШУМІЛІНА.

## ПАЛІТЫЧНЫ АНЕКДОТ

Служанка прыбягае дахаты.
—Барыня, зноў рэвалюцыя!
—І што яны хочуць?
—Хочуць, каб не было багатых.
—Дзіўна, а дэкабрысты хацелі, каб не было бедных.

## ЛЮДЗІ ДОБРАЕ ВОЛІ!

Вельмі просім вас дапамагчы ў зборы подпісаў пад зваротам у Прэзідыюм Вярхоўнага Савету БССР з просьбаю зарэгістраваць Нацыянальна-дэмакратычную партыю Беларусі. Такіх подпісаў, згодна Праекту закону аб партыях, неабходна назьбіраць 2 тысячы. Будзем удзячныя літаму нават з адным подпісам. Дасылайце яго поштаю ці перадавайце асабіста рэдактару "Пагоні". Шапка такая:

У Вярхоўны Савет Беларусі!
Шаноўныя народныя дэпутаты!

Мы, што ніжэй падпісаліся, жыхары гарадоў і вёсак зямлі беларускае, зьвяртаемся да Вас за падтрымкаю ў справе рэгістрацыі Нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі.

Прозьвішча, імя ! Адрас ! Дата ! Асабісты подпіс

## ЕШЦЕ НА ЗДАРОЎЕ!

Як паведаміў штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", часова дапушчальныя нормы ўтрыманьня радыёнуклідаў у прадуктах харчаваньня перавышаюць тыя, што існавалі ў 60-х—70-х гадох у... 10000 разоў.

## ПРАЦЭС ВЫЙГРАНЫ!

Як паведамлялася ў папярэднім нумары, за выкарыстаньне на мітынгу бел-чырвона-белага сьцяга адміністрацыйнаю камісіяю пры гарвыканкаме рэдактар "Пагоні" Уладзімер Шушкевіч ды незалежны нефармал Анатоль Мальчэўскі былі аштрафаваныя на 50 рублёў кожны. Нязгодныя з рашэньнем Уладзімер ды Анатоль падалі заявы ў народны суд Лепельскага раёну. 29 чэрвеня адбыўся судовы працэс па заяве Шушкевіча. Штраф адменены ў сувязі з тым, што адміністрацыйная камісія наклала яго без заслухоўваньня Уладзімера, які падчас яе паседжаньня знаходзіўся ў чарговым адпачынку. Працэс па заяве Мальчэўскага адбудзецца пазьней. Пажадаем жа і спадару Анатолю перамагчы лепельскую Вандэю.

## ПРОСІМ ПРАБАЧЭНЬНЯ

за адсутнасьць у рускамоўных тэкстах літары "щ" /яе замяняе "ш"/, паколькі з-за адсутнасьці беларускашрыфтовых друкавальных машынак мы вымушаны былі перарабіць расейскае "ш" на беларускае "і".

## ПАПРАЎКА

У нумары 6/8/па няўважлівасьці рэдактара дапушчана памылка: імя паэта, які на сьвяткаваньні 72-х угодкаў БНР чытаў свой верш "Прэзідэнт", не Алесь, а Павел. Просім прабачэньня ў шаноўных Паўла ды Алеся Марціновічаў.

## ЯК ПАДПІСАЦЦА НА «ПАГОНЮ»

Шмат хто пытае, ці можна падпісацца на нашае выданьне? Адказваем—можна. Для гэтага неабходна скіраваць паштовым пераводам на адрас рэдактара "Пагоні" ці перадаць яму асабіста 3 рублі. З гэтае сумы будуць адлічвацца кошт кожнага нумару ды канвэрта, у якім дасылаецца "Пагоня". Калі грошы зрасходуюцца, разам з апошнім асобнікам выданьня вы атрымаеце пісьмовае паведамленьне, пасьля чаго падпіску можна падоўжыць такім жа чынам. На адвароце паштовага пераводу пазначайце: "Для падпіскі на "Пагоню"" ды дакладна указвайце свой адрас.

## ШЧЫРА ДЗЯКУЕМ

за ахвяраваньні на выданьне "Пагоні".
Начальнік з экскаватарарамонтнага заводу—7 руб.
Лепелец—————————————4 руб.
Калгасьнік калгаса імя Тэльмана, жыхар гораду Гомлю, лепелец з вуліцы Заліннейнае, лепелец з вуліцы Інтэрнацыянальнае! Вашыя адпаведна 5, 10, 4 ды 3 рублі мы выкарыстаем на далейшую дастаўку вам "Пагоні" бясплатна.


Рэдактар Уладзімер Шушкевіч.
Адрас для карэспандэнцый ды пераводаў:
211180, Вітэбская вобл., г.Лепель, вул. Менская, д.10, кв.13, Шушкевічу Уладзімеру.
Друкарня Вітаса Шалевіча.
Наклад—999 асобнікаў.
Кошт нумару ў Лепелі—40 капеек.


Нагадваем, што бяз вашых ахвяраваньняў далейшае выданьне "Пагоні" будзе немагчымым.
Меркаваньне аўтараў зьмешчаных матэрыялаў не не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі ды кіраўніцтва БНФ.



ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!!!